ПАЛІТЫЧНЫ РЫНГ

# ГУЛЬНЯ Ў АДНЫ ВАРОТЫ

Шматпартыйнасць. Гэты тэрмін набыў непасрэднае дачыненне да Беларусі толькі ў самы апошні час. Яго маладосць і абумоўлівае тое, што нават мы, беларусы, ведаем пра свае партыі і грамадска-палітычныя рухі не вельмі многа.

І вось Інстытут павышэння кваліфікацыі арганізаваў 15 красавіка для выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін з усёй СНД сустрэчу з лідэрамі беларускіх партый і рухаў.

А. В. Астапенка — адзін з трох сустаршынь НДПБ, слабым выступленнем не здолеў зацікавіць публіку, займець прыхільнікаў сваёй партыі.

А. С. Кароль выглядаў найбольш таямнічай асобай. Партыя народнай згоды, ад імя якой ён выступаў, існуе ўсяго... чатыры дні. 11 красавіка адбыўся яе ўстаноўчы з'езд. Кароль заявіў, што ў сваёй дзейнасці партыя будзе аддаваць перавагу эвалюцыйным пераўтварэнням, а таксама пошуку згоды сярод палітычных сіл.

Л. К. Злотнікаў выступаў ад імя Руху за дэмакратычныя рэформы. Рух яшчэ малады, зарадзіўся восенню мінулага года, а сфарміраваўся толькі ў лютым гэтага года. Шырока кантактуюць са сваімі расійскімі калегамі. У сваёй прадмове прадстаўнік Руху заявіў, што згодзе дэмакратычны рух супрацьпастаўляе кампраміс. («Ісціны адной няма»), быццам гэтыя паняцці не ўзаемазвязаны. Злотнікаў не пабаяўся сказаць, што Рух выступае за раўнапраўе двух моў на Беларусі, а праграма беларусізацыі ўсіх сфер жыцця антыдэмакратычная, яна гвалтоўным чынам спрабуе забараніць рускую мову.

Тон усёй сустрэчы задаў Ю. В. Хадыка ад БНФ. Як бы мы ні ставіліся да гэтага руху, на сённяшні дзень гэта найбольш вядомая, актыўная, уплывовая палітычная арганізацыя ў рэспубліцы. І Хадыка кожным сваім словам, кожным жэстам падкрэсліваў сваю выключнасць.

І ўсё ж для поўнай палітычнай палітры рэспублікі не хапала лідэраў камуністычных аб'яднанняў. З якім бы скепсісам мы ні ставіліся сёння да адраджэння кампартыі, яна існуе, хаця і не зарэгістравана. Існуе таксама і зарэгістраваны ДСПС В. Чыкіна, асоба якога «прамывалася» амаль у кожным выступленні. Вось і атрымалася гульня ў адны вароты.

А. ЮРЫН.

# САЛДАТЫ-БЕЛАРУСЫ СКОНЧАЦЬ СЛУЖБУ У БЕЛАРУСІ. КАЛІ ПАЖАДАЮЦЬ





**Днямі больш чым сотня салдацкіх сем'яў у атрымалі радасную навіну — іх сын, брат ці муж будзе даслужваць сваю тэрміновую ў Беларусі. Магутны Іл-76 перанёс хлопцаў-беларусаў з Тбілісі, дзе яны былі сабраны згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з часцей Закаўказскай ваеннай акругі.**

**Зразумела, што служба на Беларусі лягчэйшая і, галоўнае, больш бяспечная, чым за Каўказскім хрыбтом. Апошнім іспытам для салдат, якія сабраліся на Радзіму, было доўгае чаканне самалёта на зборным пункце. Трое сутак у абсалютна непрыстасаваных памяшканнях, дрэннае харчаванне, сутычкі з воінамі іншых нацыянальнасцяў — усё гэта засталося, нарэшце, там, на чужой зямлі.**

**НА ЗДЫМКАХ: мітынг прыхільнікаў З. Гамсахурдыі; доўгае чаканне; «дзе той самалёт?»; куток старога Тбілісі.**

**Фота С. ГРЫЦА.**





# ПЫТАННІ ДА ЛІДЭРАЎ ДЭМАКРАТЫІ

***У падпісных лістах у падтрымку правядзення рэферэндуму гаворыцца, што «...кіруючая наменклатура, што перасела з кабінетиаў ЦК у кабінетиы Саўміна і Вярхоўнага Савета, праводзіць «дзікую» прыватызацыю, ператвараючы грамадсакае багацце ў сваё асабістае. Гэта злачынства выклікае абурэнне сумленных людзей».***

Але гэтыя словы, так сказаць, тэорыя. А на практыцы лідэры дэмакратычных рухаў, партый, грамадскіх арганізацый падпісваюць пагадненне і ўваходзяць у камітэт, узначаліў які старшыня Савета Міністраў В. Ф. Кебіч — наменклатуршчык № 1, які ў парушэнне законнасці даў згоду на наменклатурную прыватызацыю.

Стыхійнай і некіруемай прыватызацыю спрабуе прадставіць сама наменклатура. На самой жа справе гэта глыбока прадуманы працэс: яшчэ на пачатку мінулага года Саўмінам была закладзена структурная і метадычная аснова паэтапнага пераходу грамадскай уласнасці ў рукі наменклатуры.

Сапраўды, наменклатурная прыватызацыя — злачынства перад уласным народам, яго жорсткі падман.

Ці разумеюць гэта тыя лідэры дэмакратыі, якія падпісалі пагадненне з наменклатурай? Трэба разумець, што так.

Тады ў імя якіх больш высокіх мэтаў, чым свабода народа і яго дабрабыт, яны пайшлі на кампраміс з тымі, хто хаваў праўду аб Чарнобылі, хто, зневажаючы Закон, прыкрываючыся інтарэсамі народа, дзейнічае перш за ўсё і галоўным чынам у асабістых інтарэсах, хто вядзе справу да развалу эканомікі Беларусі?

Напужаліся магчымага перавароту ў Расіі, таго, што да ўлады там могуць прыйсці Жырыноўскі, Макашоў і ім падобныя, хто не ўтойвае свайго намеру ператварыць Беларусь у вобласць Расіі? Ці не гэта прымусіла лідэраў дэмакратыі наблізіцца да наменклатуры?

На пастаўленыя пытанні, яны, спадзяемся, адкажуць самі. Нам жа здаецца неабходным сказаць наступнае.

Палітыка — гэта не мастацтва кампрамісаў, ва ўсялякім разе, гэта ў ёй не самае галоўнае. Палітыка — гэта, калі мець на ўвазе яе псіхалагічны аспект, дакладна ўсведамляемая мэта дзейнасці, якая з'яўляецца вынікам дакладнага і глыбокага аналізу аб'ектыўных сацыяльных працэсаў. Зразумела, маецца на ўвазе дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў рамках права і маралі.

Прэзідэнт былога Саюза ўвесь час імкнуўся да кампрамісаў у палітыцы. Папракаючы іншых у тым, што яны «гайдаюць лодку», больш за ўсіх разгойдваў яе сам, бегаючы злева направа, і наадварот. Вынік вядомы: Саюз усё роўна распаўся. І калі раней рэспублікам можна было цывілізавана разысціся, дык зараз кожная будзе выплываць, разлічваючы толькі на ўласныя сілы.

Галоўнае ў палітыцы — эканоміка, у эканоміцы — уласнасць. Апошняе — гэта тое асноўнае, вакол чаго круціцца і будзе круціцца палітыка, у якую б адзежу яна ні апраналася (камунізму, фашызму, нацыяналізму, лібералізму і г. д.) і якімі б словамі ні прыкрывалася.

Палітыка пранізвае ўсе поры грамадскага жыцця. Нават падпісанне індывідуальнага кантракта з работнікам — гэта палітыка. У нашых умовах падпісанне такога кантракта — падман простых грамадзян, які накіраваны на захаванне наменклатурнай уласнасці і, такім чынам, эканамічнай і палітычнай улады.

Сёння грамадзяне Беларусі не вераць нікому: ні правым, ні левым, ні рухам, ні партыям. Яны не павераць ні ў якія праграмы, дэкларацыі, заявы: столькі разоў іх падманвалі, настолькі ва ўсім і ўсіх яны расчараваліся. Мінулыя выбары паказалі, што тыя, за каго яны галасавалі, перш за ўсё вырашаюць асабістыя справы, а многіх дэпутатаў-дэмакратаў наменклатура купіла пасадамі, пазачарговым атрыманнем кватэр, машын, замежнымі камандзіроўкамі і г. д.

Без падтрымкі народа ніякая ўлада доўга пратрымацца не можа. Зараз відавочны параліч улады — адна з самых небяспечных з'яў для функцыяніравання дзяржаўнасці ў рамках закону. На месцах наменклатура сабатуе ўсё тое, што не супадае з яе інтарэсамі, але не нясе пры гэтым ніякага пакарання. Для наменклатуры характэрная кругавая парука. У той жа час спыняецца прамысловасць, скарачаецца сельскагаспадарчая вытворчасць, усё больш дэстабілізуецца фінансавая сістэма. Улада губляе апору ў народзе.

Вось тут і ўзнікае патрэба ў знешняй небяспецы. Калі яе няма, такую небяспеку неабходна прыдумаць. Гэта, на наш погляд, адна з прычын утварэння так званага антыкрызіснага камітэта, створанага, як адзначаецца ў падпісаным урадам і дэмакратычнымі лідэрамі пагадненні, на выпадак магчымай знешняй небяспекі.

Хто ж нам пагражае? Літва, Польша, Украіна?.. Застаецца толькі Расія! Расія, разам з якой выстаялі ў час апошняй вайны, якая дапамагла нам стварыць развітую прамысловасць, зламала хрыбет таталітарызму. Зараз яна — патэнцыяльны праціўнік.

Небяспека, з нашага пункту гледжання, зыходзіць не ад Расіі, а ад наменклатуры, галоўнае для якой — любой цаной захаваць уладу і, такім чынам, уласнасць і прывілеі. Па віне наменклатуры замест лібералізацыі цэн мы атрымалі іх павышэнне, замест прыватызацыі — «прыхватызацыю», замест рынку — пародыю на яго. Гэта значна горш, чым адміністрацыйна-камандная сістэма.

У сітуацыі, якая ўсё горш, наменклатуры нічога не застаецца, як скардзіцца на народ: Сапраўды, людзі працуюць дрэнна. Але ніякімі падаткамі, ніякім зніжэннем жыццёвага ўзроўню не прымусіць іх працаваць лепш. Кожны чалавек хоча працаваць перш за ўсё на сябе самога, а не на камунізм, дзяржаву і г. д.

Зніжэнне жыццёвага ўзроўню прывядзе да змяншэння спажывання і, як вынік, да падзення вытворчасці. Гэта — азбука эканомікі. Праўда, нармальнай эканомікі, якой у нас пакуль няма.

Нармальная, рыначная эканоміка дае свабоду асобе і прадпрымальніцкай дзейнасці, што, у сваю чаргу, патрабуе прыватнай уласнасці. У нас жа — прымусова-размеркавальная эканоміка, якая грунтуецца на дзяржаўнай уласнасці.

Пры манапалізме дзяржаўнай уласнасці чыноўнік з'яўляецца ўласнікам улады, якую ён ужывае перш за ўсё ў сваіх інтарэсах у адпаведнасці з асабістым разуменнем маралі. Імкненне камандаваць, размяркоўваць, судзіць ці мілаваць па свайму меркаванню — псіхалагічная хвароба наменклатуры. Пазбавіцца яе, як паказалі апошнія сем гадоў, яна не можа.

Антыкрызіснае пагадненне — чарговая хітрасць наменклатуры. Галоўнае ў ім — падладжванне пад дэмакратычныя сілы, каб захаваць і замацаваць уласную ўладу. Але магістральнае развіццё чалавецтва — дэмакратыя. Толькі на яе аснове можна цяпер паправіць справы да лепшага. Усялякія ГКЧП, камітэты нацыянальнага выратавання, антыкрызісныя камітэты і інш. толькі адкінуць народы назад у эканамічным і любым іншым развіцці.

Зразумела, з крызісу выходзіць трэба. І існуе вельмі просты, з нашага пункту гледжання, спосаб для гэтага: прапанаваць кожнаму чалавеку стаць уласнікам.

Зараз уласнасць на незаконных падставах належыць наменклатуры, усе намаганні якой накіраваны на тое, каб стаць уласнікам законна. Таму і цягнецца час, бясконца абмяркоўваюцца жыццёва важныя законы, а калі яны і прымаюцца, дык з хітрыкамі для рэалізацыі інтарэсаў наменклатуры.

Аднак час больш не цярпіць. Мы знаходзімся на мяжы эканамічнага краху. Каб гэтага не здарылася, каб не было сацыяльнага выбуху, неабходна распачаць працэс ператварэння наёмных работнікаў ва ўласнікаў, г. зн. неабходна прыватызацыя і лібералізацыя цэн. Галоўнае пры гэтым — каб кожны грамадзянін Рэспублікі стаў уласнікам роўнай для ўсіх долі нацыянальнага багацця, атрымаў роўныя стартавыя магчымасці пры пераходзе да рынамнай эканомікі. Як ён далей распарадзіцца сваёй уласнасцю — яго асабістая справа. Няхай затым праяўляюцца здольнасці асобы, яе інтэлект, ініцыятыва, прадпрымальнасць. Але ў пачатку ўсе павінны быць роўныя.

Стварэнне антыкрызіснага камітэта ўводзіць людзей убок ад вырашэння асноўнай задачы рэфармавання грамадства — змяненне формы ўласнасці.

Што датычыць знешняй пагрозы, яна надумана. Вяртанне ж да мінулага немагчыма ні ў нас, ні тым больш у Расіі.

Беларусь будзе незалежнай: людзі цудоўна разумеюць, што навесці парадак у невялікай гаспадарцы значна лягчэй, чым на той велізарнай прасторы, якая раней называлася СССР.

І зусім не трэба для дасягнення гэтага настройваць беларускі народ супраць іншых народаў.

І. МАРОЗАЎ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ПЕРШЫ ПАЎПРЭД:

# «ШЧАСЦЯ ЗА ЧУЖЫ КОШТ НЕ БЫВАЕ»

**Мікалай Максімавіч ШУМЕЙКА, намеснік дырэктара НДІ ядзерных праблем па навуковай рабоце, прызначаны паўнамоцным прадстаўніком Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследванняў (АІЯД).**

**Прапануем вашай увазе першае інтэрв'ю першага паўпрэда нашай дзяржавы ў арганізацыі, членам якой яна стала таксама ўпершыню.**

— Мікалай Максімавіч, ці стала новае назначэнне значнай падзеяй у Вашай карʼеры і жыцці?

— Не, ні ў якім разе. Хутчэй, гэта натуральны працяг той работы, тых кантактаў, якія звязвалі мяне з АІЯД, пачынаючы з 1964 года, калі я ўпершыню прыехаў сюды, у філіял МДУ у Дубне, з Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў якасці студэнта 4 курса для заканчэння адукацыі ў галіне фундаментальных даследванняў, па накіраванню кафедры ядзернай фізікі. Гэтыя сувязі з Аб'яднаным інстытутам ніколі не губляліся надоўга: самым працяглым перапынкам была гадавая служба ў арміі.

Гэта зусім не ганаровае, а рабочае назначэнне, яшчэ адзін абавязак...

**— Ці адчуваеце Вы змены ў адносінах да Вас знаёмых, калег у сувязі з новай пасадай?**

— Зразумела, не ўсе глядзяць на гэта з майго пункту гледжання. Усё ж такі ў нашым грамадстве ў многіх захавалася нейкае пакланенне перад таямніцай улады. І калі людзі чытаюць у газеце: «Саўмін прызначыў...» — яны аўтаматычна перабольшваюць значнасць такой падзеі. На самой жа справе падзея даволі радавая: трэба было даручыць некаму гэты ўчастак работы. Выбар спынілі на мне, бо сярод беларускіх фізікаў майго пакалення я, бадай, найбольш інтэнсіўна ўдзельнічаў усе гэтыя гады ў рабоце, якая вялася ў Дубне, і ведаў становішча там — магу гаварыць аб гэтым без залішняй сціпласці. Не па чутках, а па дзелавых кантактах знаёмы з шырокім колам людзей у АІЯД — ад дырэкатара інстытута да маіх непасрэдных калег.

...А ва універсітэце, здаецца, амаль ніхто і не ведае аб назначэнні мяне паўпрэдам у Аб'яднаным інстытуце.

**— Ці адыдзе цяпер Ваша работа на пасадзе намесніка дырэктара НДІ на другі план?**

— Зразумела, не. Тут — мая асноўная дзейнасць. І не так у ролі намесніка дырэктара па навуковай рабоце (хоць гэта далёка не самая адміністрацыйная з адміністрацыйных пасад), як у якасці навуковага работніка, кіраўніка даволі буйной навуковай тэмы. І тое, што мая асноўная работа — тут, у НДІ, фактычна спалучаецца з тым, што па-сапраўднаму безупынным павінна быць менавіта навуковае ўзаемадзеянне з АІЯД.

Вось на маім стале праблемна-тэматычны план навукова-даследчых работ і міжнароднага супрацоўніцтва Абяднанага інстытута ядзенрных даследванняў на 1992 год. Не хачу хваліцца, але я і мае супрацоўнікі запісаны тут у тры, нават у тры з паловай тэмы, і гэта зусім не фармальны запіс.

**—— Як паведаміла прэса, Вам належыць «пры ўзгодненасці з Акадэміяй навук Беларусі, Міністэрствам адукацыі і Дзяржэканомпланам фарміраваць і прадстаўляць на зацвярджэнне Саўміна гадавыя каардынацыйныя планы навукова-даследчых работ, выконваемых у Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследванняў з удзелам устаноў і арганізацый нашай дзяржавы». Што яшчэ уваходзіць у Вашы абавязкі? Ці распачалі Вы ўжо іх выканање?**

— Распачаў даўно, яшчэ да таго, як быў афіцыйна прызначаны на гэту пасаду. У лістападзе мінулага года з АІЯД прыехаў сюды выпускнік нашай кафедры і прывёз прапанову аб уступленні Беларусі ў склад Аб'яднанага інстытута. Ён прыйшоў да мяне — мы працавалі на агульнай тэме — і папрасіў аказаць садзейнічанне ў сустрэчах з патрэбнымі для вырашэння гэтага пытання людзьмі, у тым ліку ва ўрадзе. Я чым мог дапамог. А да таго часу, калі Вярхоўны Савет і Савет Міністраў далі згоду на ўступленне нашай дзяржавы ў АІЯД, у мяне ўжо былі канкрэтныя прапановы на гэты конт. Разам з маім калегам з Інстытута фізікі АН Беларусі, таксама нашым выпускніком, Аляксандрам Сяргеевічам Курылiным, мы правялі работу па збору прапаноў зацікаўленых арганізацый рэспублікі аб кантактах з Аб'яднаным інстытутам. Вось перада мной пакет гэтых прапаноў, яны выкарыстоўваюцца пры складанні праекта каардынацыйнага плана.

Другая важнейшая частка работы — фінансавая. Зразумела, што навука мае патрэбу ў першую чаргу ў матэрыяльнай падтрымцы. Фізіка — эксперыментальная навука, ядзерная фізіка — тым больш, а гэта патрабуе значных сродкаў.

Наша дзяржава, Рэспубліка Беларусь, павінна ўнесці па пэўнай схеме пэўную суму грошай у бюджэт АІЯД. Я лічу, што гэтыя грошы не павінны быць безаблічнымі, мы павінны пералічваць іх на канкрэтныя праекты — вядома, у адпаведнасці з правіламі, што ўстаноўлены ў Аб'яднаным інстытуце (пэўны працэнт ад гэтай сумы павінен ісці на падтрыманне так званай інфраструктуры інстытута). Сума, якая будзе пералічана, яшчэ не вызначана, больш таго, пакуль не выпрацаваны механізм фінансавання ўдзелу рэспублікі ў міжнародных навуковых арганізацыях — наколькі мне вядома. Акрамя праекта каардынацыйнага плана, я рыхтую запіску кіраўніцтву Рэспублікі Беларусь, дзе прапаную такі механізм. Ён будзе разгледжаны экспертнай групай. Зараз вельмі важна выпрацаваць гэты механізм як мага больш аператыўна і дакладна.

Агульная ж палітыка — у тым, што на базе АІЯД беларускія вучоныя выконваюць тыя работы, якія па нейкіх прычынах (часцей за ўсё — матэрыяльна-тэхнічных) не могуць выканаць тут.

**— Расскажыце, калі ласка, крыху аб гісторыі стварэння і развіцця Аб'яднага інстытута ядзерных даследванняў.**

— Пасля вайны ў Дубне была створана лабараторыя ядзерных праблем Акадэміі навук СССР, якая пазней ператварылася ў Інстытут ядзерных праблем. Ужо ў 1949 годзе тут пачаў дзейнічаць найноўшы для таго часу сінхрацыклатрон. Ён быў створаны больш чым на 90 працэнтаў з айчыннага абсталявання. Разбураная вайной краіна прадэманстравала такім чынам, у першую чаргу сабе, свой патэнцыял.

З надыходам «вясны» 1953 года, калі была прыўзнята «жалезная заслона», пачало развівацца міжнароднае супрацоўніцтва, перш за ўсё паміж СССР і сацыялістычнымі краінамі. У 1956 годзе на базе Інстытута ядзерных праблем быў створаны Аб'яднаны інстытут ядзерных даследванняў, членамі якога сталі амаль усе сацыялістычныя краіны, акрамя Югаславіі. Паступова інстытут ператварыўся ў буйную ўстанову з 5 тысячамі супрацоўнікаў. У прынцыпе, гэта не адзін, а некалькі інстытутаў, якія завуцца лабараторыямі (зараз іх у складзе АІЯД сем), рознага профілю. Інстытут унікальны ў сэнсе шырыні даследванняў, што праводзяцца тут. У адрозненні ад ядзерных даследванняў — ЦЭРНа, дзе займаюцца ў асноўным фізікай высокіх энергій, у АІЯД праводзяцца даследванні па фізіцы высокіх энергій, фізіцы прамежкавых і нізкіх энергій, фізіцы нейтронаў, фізіцы цяжкіх іонў, тэарэтычнай фізіцы, а таксама даследванні канцэтраванага стану рэчаў ядзерна-фізічнымі метадамі. Такім чынам, тут прадстаўлены фактычна ўвесь спектр той навукі, якая завецца сёння ядзернай фізікай. І ёсць буйныя дасягненні ў пэўных галінах. Але ўзровень матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння значна ніжэйшы, чым у тым жа ЦЭРНе (яго гадавы бюджэт складае каля 900 млн. швейцарскіх франкаў, а бюджэт АІЯД склаў у мінулым годзе прыблізна 50 млн. рублей).

...Першыя змены ў структурнай арганізацыі Аб'яднанага інстытута ядзерных даследванняў адбыліся пасля таго, як яго пакінулі ў пачатку 60-х гадоў Кітай і Албанія, а новым членам стала Куба. Наступную перастаноўку прынесла аб'яднанне Германіі — ГДР спыніла існаванне, у тым ліку як член АІЯД, але рэальны ўклад Германіі працягваецца. Так, у мінулым годзе адтуль паступіла ў бюджэт інстытута 3 млн. марак, столькі ж паабяцана і ў гэтым годзе.

Пасля распаду сацыялістычнага лагеру ні адна дзяржава не выйшла з АІЯД. Наадварот, усе пацвердзілі сваю зацікаўленасць у рабоце, толькі на новых умовах — мэтавага фінансавання навуковых праектаў. Я лічу, что наша дзяржава павінна падтрымаць менавіта такі падыход.

Апошнія структурныя змены адбыліся ў Аб'яднаным істытуце пасля распаду Савецкага Саюза. Амаль адразу пасля гэтай падзеі ў склад АІЯД былі прыняты тры дзяржавы: Расія, Украіна і Беларусь. Пазней да іх далучыліся некаторыя іншыя рэспублікі былога Саюза.

**— Ці ўваходзяць у Вашы планы кантакты з ЦЭРНам? Ці можа Беларусь стаць членам гэтай арганізацыі?**

— Я вярнуўся з камандзіроўкі ў ЦЭРН у пачатку сакавіка. Як у кіраўніка навуковай тэмы, у мяне ёсць даўнія сувязі з гэтай арганізацыяй.

Беларусь пакуль не можа стаць членам ЦЭРНа — з-за адсутнасці валюты. Але я ўзяў на сябе ініцыятыву, калі сустракаўся з намеснікам дырэктара ЦЭРНа прафесарам Мантанэ, абмеркаваць формы ўзаемадзеяння дзяржаў накшталт нашай з гэтай арганізацыяй. І атрымаў у яго праект пагаднення паміж Індыяй і ЦЭРНам і праект пагаднення, ужо несапраўды, паміж Савецкім Саюзам і ЦЭРНам. Пасля перадачы ўраду праекта каардынацыйнага плана збіраюся выкласці і таксама перадаць кіраўніцтву Беларусі прапановы аб ўзаемадзеяннях беларускіх вучоных з ЦЭРНам.

**— Ці адчуваеце Вы на сабе цяжар гістарычнай адказнасці? Вы — першы паўнамоцны прадстаўнік Беларусі ў Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследванняў, і Вашы паслядоўнікі будуць раўняцца ў сваёй дзейнасці на Ваш вопыт...**

— Я не задумваўся аб гэтым цяжары спецыяльна. Але калі рыхтую вось гэтыя важныя дакументы, часта адчуваю жаданне пайсці да каго-небудзь і спытаць... Потым пачынаю разумець, што ад мяне чакаюць іншага — менавіта майго асабістага, арыгінальнага падыхода.

. У мяне былі зносіны з прадстаўнікамі іншых дзяржаў у АІЯД, я цікавіўся колам іх задач, метадамі работы, статусам і ўзаемаадносінамі з урадам. Але акрамя іх вопыта, у мяне ёсць сваё бачанне праблемы.

**— Ва універсітэце часцяком гавораць аб тым, як нам пашчасціла: Шушкевіч, Дзямчук, Гайсёнак — усе «нашы» людзі. Цяпер яшчэ і Шумейка... Ці можа БДУ і яго НДІ ЯП разлічваць на асаблівыя адносіны паўпрэда АІЯД да іх праблем?**

— Зразумела, карысць будзе. Але толь ў той меры, што і для іншых НДІ і ВНУ рэспублікі. Натуральна, што трэба праводзіць вельмі ўзважаную палітыку падтрымкі ўсіх беларускіх арганізацый і вучоных, якія маюць неабходнасць, магчымасць і жаданне супрацоўнічаць з Аб'яднаным інстытутам. Так, свая кашуля бліжэй да цела, як кажуць. Але я перакананы, што нельга абараняць уласныя інтарэсы на шкоду іншым. Гэта дапушчальна толькі ў той ступені, у якой гэтыя інтарэсы суадносяцца з рэальнасцю. Так, зараз уклад НДІ ядзерных праблем, іншых інстытутаў і кафедр нашага універсітэта ў даследванні, якія праводзяцца ў АІЯД, сапраўды значны. Мы ідзем у гэтым сэнсе, калі меркаваць па заяўках, па меншай меры на роўных з АН Беларусі.

**— Мікалай Максімавіч, Ваша навуковая кар'ера — доказ таго, што і ў нашых умовах, нягледзячы на відавочнае засілле пратэкцыянізму, можна ісці да вяршынь, абапіраючыся на ўласныя сілы, а не на дапамогу звонку. Што б Вы маглі параіць у гэтай сувязі маладым?**

— Галоўнае, на мой погляд — не кар'ера ці яшчэ якая мэта: абарона дысертацыі, высокая пасада... Галоўнае — работа! А ўсё астатняе прыйдзе як вынік яе. У Карнегі ёсць цудоўная сентэнцыя, заснаваная на жыццёвым вопыце: рабі людзям дабро дзеля асабістага задавальнення і не чакай удзячнасці. Так і з кар'ерай... Сёння трэба пазбаўляцца ад утрыманскага настрою і рабіць сваю справу, жыццё, лёс сваімі рукамі, не дазваляючы зневажаць сябе і не зневажаючы іншых. Не рабіць сваё шчасце за кошт іншых — вось, як мне здаецца, галоўны прынцып.

Гутарку вяла
Вераніка БЯГУН.

ДЫСКУСІЯ

# ДАЛОЎ ДРАПЕЖНІКАЎ!

***Давайце пагаворым пра «вампіраў». Каб потым, вычарпаўшы тэму, не ўспамінаць яе ніколі.***

***Вы згодны, што жахамі поўніцца ўвесь сённяшні свет? І, адарваўшыся на момант ад сузірання чэргаў і сацыяльнай неўладкаванасці, трапляем вокам у газету акурат туды, дзе цягне за душу загаловак, абяцаючы нешта на мяжы верагоднага.***

***Прыгадаем серыю артыкулаў «Вампіры і ахвяры», якую друкуе газета «Рэспубліка». Калі вы іх не чыталі, вам моцна пашанцавала, калі наадварот — тады, напэўна, нялішне пазнаёміцца з іншым поглядам на тую ж праблему.***

У вышэй азначаных артыкулах аўтар С. Анупрыенка, абапіраючыся на старажытнакітайскую традыцыю ў разглядзе «энергетычнага жыцця» чалавека і ўсходні варыянт гараскопаў, так званы «круг звяроў», робіць прагнозы адносна энергетычных вынікаў, што пагражаюць пры нябачлівых зносінах людзей розных знакаў. Прачытаўшы, я пашкадавала, што не вывучала іерогліфы або старажытнакітайскую метафізіку на належным узроўні. Лягчэй было б абвяргаць.

Не сакрэт, што ўсе мы дылетанты ў тых навуках, якія завуцца акультнымі. Іх прэрагатывай дагэтуль з'яўляюцца шмат цікавых рэчаў, у тым ліку і таямнічая біяэнергія. А паколькі мы дылетанты, мы або верым таму, што прапануе больш дасведчаны, або не. З другім выпадкам лягчэй, там пытанні ўжо не ўзнікаюць. А калі падсвядома здаецца: «нешта ў гэтым ёсць»? Прачытаўшы такі артыкул, уладальнік «звычайнай» свядомасці жахнецца, успамінаючы жывапісанне вынікаў, сімптомаў і парады, як абараняцца. І гэта на поўным сур'ёзе. Хто можа сказаць, як адгукнецца ў нашай і без таго ўзбуджанай псіхіцы такі акцэнт на «раскошу чалавечых адносін»? Хіба словы А. дэ Сент-Экзюпеоры губляюць сэнс? Але што за жыццё тады мы сабе абіраем?! Як давесці, што не трэба шыцца ў вугал, калі вам прарочаць «энергетычны крызіс» пасля сустрэчы з «Зайцам» — хіба ён вінаваты, што нарадзіўся ў той год? Гэты ж «Заяц» можа мець вялікую душу і талент памочніка (прыклад — амерыканскі паэт Уолт Уітмен). Можа, усё ж не трэба бегчы наўскапыт ад «Тыгра»? Сярод іх, безумоўна, няма людзей незваротна сконачаных. Зыходзячы, як у Булгакава, «са здаровага сэнсу і жыццёвай вопытнасці», можна паставіць пад сумненне практычную карысць таго серыяла публікацый.

**Аб ЭНЕРГЕТЫЧНЫМ АСПЕКЦЕ.** Так званае «энергетычнае» жыццё чалавека захоўвае ў сабе столькі таямніц, што тут не абыдзешся нават усёй старажытнакітайскай традыцыяй. Таму неразумна нешта дэкларававаць у гэтай галіне, бо жыццё наша адразу ж адмаўляе рамкі тэорый, яно шырэй за схему ў любым выпадку. (Мы ж з вамі маем справу менавіта з жыццём). Да таго ж, справа не безнадзейная нават з пункту гледжання старажытных кітайцаў. Гэтак жа, як і індыйскія ёгі, яны ведалі, што чалавек, акрамя ўсяго іншага, існуе і як праваднік нябесных энергій (мае «энергетычнае цела»). Заўважце: праваднік, а не акумулятар. Дыхальнымі ці іншымі практыкаваннямі кітайцы трэніравалі гэтае цела, павялічваючы свае магчымасці.

І вельмі важная дэталь: гэтая пакуль што няўлоўная для многіх з нас і нашых прыбораў энергія, па паняццях старажытных кітайцаў, уяўляе сабой энергію Матухны Прыроды, бясконцую субстанцыю. Нашы вучоныя-першапраходцы зараз адзін за адным адкрываюць гэты акіян энергій, называючы яго хто «электронным акіянам», хто «біяплазменнай энергіяй»; у Жывой Этыцы ён — «псіхічная энергія», у Біблії — Святы Дух, у Ведах — Чыт-Сат-Ананда. Менавіта пра яе бясконцасць апавядаюць філасофска-рэлігійныя першакрыніцы. Маленькі струменьчык яе праходзіць праз нас, надзяляючы нас жыццёвай сілай, мы не можам утрымаць яго гэтак жа, як і спыніць. Мы можам толькі падзяліцца. З сябрамі, незнаёмымі, з усімі добрымі людзьмі. І рэлігіі даводзяць, што ад гэтага чалавек не можа збяднець, наадварот — ён пойдзе шляхам духоўнага развіцця. (Хрыстос прасіў раздаваць менавіта духоўнае багацце). Заклік дзяліцца сваёй душой (літаральна, бо размова ідзе пра духоўную энергію) гучаў у вуснах многіх вялікіх. І толькі скептыкам, якія не адчуваюць за словамі адпаведнага боку рэальнасці, больш зразумелы

**МАРАЛЬНЫ АСПЕКТ.** Што вы робіце, прачытаўшы перасцярогу «трымаць вуха востра», бо нехта можа абрабаваць вас, адхапіўшы смачны кусок (энергіі!?)? Купіце баракамеру, каб хавацца ад знаёмых?

Спытайце ў экстрасенса — ён вам скажа, што страх знішчыць вашу жыццёвую энергію хутчэй. Ды й ці трэба баяцца?

Прыгадайце: вялікія заснавальнікі сусветных рэлігій, дасягнуўшы духоўных вяршынь, ніколі не зацвярджалі страх і варожасць. Гэты калідор вядзе ў тупік. Наадварот, ва ўсе часы чалавецтва заклікаюць стварыць асяроддзе радасці, добразычлівасці, дзейснай любві. Бог ёсць любоў. Мы моцна звязаныя адно з адным у грамадстве, на адной Зямлі, і самае неразумнае — гэта пачынаць «паляванне на ведзьмаў». Мы не можам жыць паасобку. Жывая Этыка (на тое ж і этыка, каб быць жывой) узводзіць прынцып **СУПРАЦОЎНІЦТВА** ў рынг касмічных законаў, што неверагодна паскараюць эвалюцыю. І ў гэтым ёсць надзея і радасць. Нашто абмяжоўваць сябе нейкай бояззю, калі Прыродзе ўласціва бясконцасць? Прырода не памылілася з «энергетычным нераўнапраўем». Успомніце натуральнасць усеабдымнага прыроднага энергаабмену.

Наша рэчаіснасць падносіць нам штодзень падарункі, якія лепш не ўспрымаць аднабакова. Б. Шры Раджніш сказаў, што жыццё — гэта чысты аркуш, на якім можна намаляваць радасць, а можна і наадварот, і ў кожнага ёсць шанц. Ён меў на ўвазе нашу суб'ектыўную здольнасць глядзець на жыццё праз эмоцыі розных адценняў. Трэба толькі штосьці змяніць у сабе, і свет вакол раптам стане іншым. Гэта ісціна з Усходу старая, як сам свет.

Кожны з нас рэалізуе ўласнае разуменне маралі і атрымлівае адпаведныя вынікі. Таму на свеце стане чысцей, калі мы будзем глядзець на бліжняга свайго без падазронасці, не шукаючы «зачэпак» у яго гараскопе.

**Наталля ЖУК.**

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

*Сёняшні выпуск «Аўдыторыі № 7» — крок насустрач пажаданням нашых маламаёмых чытачоў. Музычных выданняў у кіёсках усё больш — так, што вочы разбягаюцца і слінкі цякуць, а прагматычнае стагоддзе дыктуе свае ўмовы: спачатку хлеб, а потым песня. Мы ж тым часам прапануем музычны дайджэст.*

## НОВЫЯ ІМЁНЫ

### КАСЯ КАМОЦКАЯ І «НОВАЕ НЕБА»

Кася пачынала як бард, але рамкі гэтага жанру аказаліся для яе цеснымі. Яе захоплівае работа над аранжыроўкамі песень, таму што не хоча абмяжоўвацца дакладна вызначаным наборам інструментаў. З-за гэтага, калі Кася з'яўляецца ў студыі гуказапісу, яе работнікі часта жартуюць: «У наступны раз, Кася, ты, напэўна, прывядзеш з сабою цэлы сімфанічны аркестр».

Акрамя пастаяннага спадарожніка — гітарыста Лявона Шырына — Касе дапамагаюць музыканты з тэатра-студыі «Мроя». Гэта і хлопцы з аднайменнага рок-гурта, і Лена Вішнеўская (скрыпка) з Юлей Глушыцкай (віяланчэль) са струннага квартэта. Вось так на аснове Касінай работы над песнямі ў тэатры-студыі «Мроя» нарадзілася новая творчая лабараторыя, якая атрымала назву «Новае неба».

Творчая канцэпцыя лабараторыі — пастаянны пошук цікавых музычных варыянтаў, не абмежаваных вызначанымі традыцыямі і накірункамі ў музыцы. Акрамя арыгінальных аранжыровак, прыцягвае цікавы своеасаблівы вакал. Усе песні Кася піша на вершы маладых беларускіх літаратараў.

(«Поп-музыка»)

## НОРАВЫ «ІХНЯГА» ЖЫЦЦЯ

**ROЛЛINS STONES падпісалі кантракт з фірмай «Вірджын» на 10 год коштам 35 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Біл Уаймен свой подпіс пакуль не паставіў. Выходзіць, што ён вымушаны будзе торгаць басавую струну і трасціся па гастролях ажно да 65 год. Гэта ўжо не ў кайф.**

**Відэакліп аўстралійскага гурта *DIVINYЛS* «Я дакранаюся да сябе» забаронены для паказу на брытанскім тэлебачанні. Увогуле, Англія — краіна з ліберальнымі поглядамі. Але ўсяму ёсць мяжа.**

Канцэрт пад назвай «Сцяна», які прайшоў ля рэштак Берлінскай сцяны, прынёс Роджэру Уотэрсу толькі галаўны боль. Мала таго, што выканаўцы фальшывілі, дык яшчэ і фінансавыя праблемы — замест запланаваных шасці мільёнаў фунтаў, якія экс-лідэр «Пінк Флойд» абавязаўся пералічыць дабрачыннаму фонду *«THE MEMORIAL»*, прыйшлося абмежавацца 580 тысячамі. Астатнія пайшлі на пакрыццё надта вялікіх выдаткаў.

**У Мілане асвісталі Сцінга! 13 тысячаў гледачоў былі расчараваны яго новым рэпертуарам. Бедны спявак пакінуў сцэну, нават не развітаўшыся з публікай.**






**ДВА ДНІ ў канцы лютага — пачатку сакавіка ў Мінску праходзіў фестываль у абарону музычных меншасцяў Беларусі, відовішча, падобнага на якое ў нашым горадзе раней не адбывалася. Арганізацыйную работу па падрыхтоўцы і правядзенню фестываля ўсклалі на сябе маладыя журналісты газеты-клуба «ТАКАЯ ЖИЗНЬ-2».**

**За два дні выступіла каля 20 груп, якія прадстаўляюць самыя розныя музычныя стылі: ад класічнага блюза і рок-н-рола да панка і авангарда.**

**Перапоўненая зала Дома настаўніка ледзь стрымлівала нацiск жадаючых пачуць сапраўдны андэграундны рок. Больш за ўсё гледачам і незалежным рок-журналістам, якія прыехалі на фестываль са ўсяго былога Саюза, запомніліся мінскія групы «Общество мертвых поэтов», «Нейро Дюбель», «Ляпис-Трубецкой», «Боба Шышкин и Паливо», віцебская «Мама дала банку», гомельская «Эдгар По».**

**Ідэя абароны некамерцыйнай музыкі ад кан'юнктуры музычных густаў, якія пераважаюць, спадабалася многім, і пасля фестывалю групы-удзельніцы сталі часцей запрашацца на канцэрты.**

**Больш падрабязна даведацца пра фестываль можна з пятага нумара «ТАКОЙ ЖИЗНИ-2». Тэлефон газеты-клуба «ТАКАЯ-ЖИЗНЬ-2» — 29-04-91.**
**Фота А. ШЫШКІНА (Масква).**







## ТАЛЬКОЎ МОГ ЗАСТАЦЦА ЖЫВЫМ

**але некампетэнтнасць айчынных шоубізнесменаў рана ці позна прывяла б да трагедыі**

Трагічная падзея, якая адбылася 6 кастрычніка ў Санкт-Пецярбурзе, не магла прайсці па-за ўвагай рок-журналістаў і музычных крытыкаў. Галоўны рэдактар часопіса «Давай! Давай!» **Уладзімір МАРАЧКІН** так каменціруе гэты трагічны выпадак:

— Няшчасце рана ці позна павінна было здарыцца. Разумныя людзі даўно папярэджвалі: не ўдзельнічайце ў «зборных салянках»! І многія выканаўцы ўжо заявілі, што будуць працаваць толькі ў сольных праграмах, як, напрыклад, Уладзімір Маркін і яго гурт «Трудное детство». «Зборныя салянкі» ужо даўно сталі рассаднікам спрэчак, жульніцтва і рэкету. Толькі абсалютна паважаны арганізатар, так сказаць, «гаспадар рэальнасці», мог разгулу стыхіі і хаосу супрацьпаставіць хоць нейкую арганізацыю. Але ж сёння зборныя канцэрты праводзяць усе, хто толькі пажадае, таму крымінагенная абстаноўка за кулісамі ўсё больш абвастраецца.

У сувязі з гэтым хачу звярнуць увагу вось на што: некампетэнтнасць ужо даўно стала асноўным прынцыпам «саўка». Чым чалавек больш некампетэнтны, тым вышэй яго месца ў іерархіі кіравання, хаця павінна быць наадварот.

Ці можна было пазбегнуць гэтага няшчасця? Так, калі б арганізатары канцэрта валодалі дастатковай кампетэнтнасцю ў шоу-бізнесе. Альбо калі б дастатковай доляй кампетэнтнасці валодала тая ж Азіза. Зараз яна запэўнівае, што не мела да гэтага інцыдэнту ніякага дачынення, але тое, што яна не здолела арганізаваць работу свайго адміністратара (ці хто ён для яе?) і гэта прывяло да гібелі спевака, робіць яе віну больш цяжкай, чым віна самога забойцы. Можа яна і нядрэнная спявачка, з цудоўным голасам, пластыкай, але, баюся, яна стане ў адзін рад з Сальеры, Мартынавым, Дантэсам, і яе чакае байкот з боку арганізатараў Расіі і прэсы. Што ж, можа гэта будзе крокам, шкада, што такім трагічным, у барацьбе з некампетэнтнасцю ў музычным бізнесе.

А сам забойца... Яго пакаранне не за гарамі, але важна зразумець, што яго стрэл быў яшчэ і следствам нашага бязглуздага і гнюснага жыцця.

Усё, пра што тут ішла гаворка, тычыцца толькі поп-музыкі. Калі шчыра, я не ўяўляю сабе, каб адміністратар Барыса Грабеншчыкова пайшоў такім чынам, з пісталетам у руках, разбірацца, напрыклад, з Юрыем Шаўчуком.

Жывем мы ў неспакойны час. Хаос паўсюдны: на вуліцах, у палітыцы, у нашых душах. І асбурд заўсёды даходзіць да свайго крытычнага пункта. Супрацьстаяць яму можа толькі імкненне да разуму, духоўнасці.

## «Музабоз»: погляд з абозу

**Той, хто працуе на тэлебачанні, як правіла, заўсёды «пры справах». Таму не надта засмучайцеся, што гаварыць пра папулярны «Музабоз» будзе не каардынатар усіх музычных праграм «Взгляда» Марына Лазавая і не рэжысёр праграмы Іван Дзямідаў, а журналіст Эркін Тузмухамедаў. Ён хоць і не першы козыр, але ля вытокаў стаяў, у тусоўцы вядомы...**

**— Эркін, адкуль завітаў да нас абоз?**

— За нядоўгія паўтара месяцы існавання «Ша Мажора» (пробнага шара ў стварэнні інфармацыйна-музычнай тэлепраграмы) мы навучыліся ствараць кароткія рэпартажы. Але захацелася зрабіць нешта больш працяглае па часу і больш змястоўнае па тэматыцы. Ідэя належыла Марыне Лазавой.

**— Хто прапанаваў застаўку «Музабоза»?**

— Ствараючы перадачу, мы думалі — як зрабіць, каб можна было задаваць інтэрв'юіруемаму самыя нечаканыя пытанні. Была думка паказаць адразу двух вядучых — адзін бярэ на сябе эстэтычную функцыю, задае нармальныя пытанні, а другі — у выглядзе гратэскнай лялькі, будзе дурэць, пытацца пра тое, аб чым не прынята гаварыць. Але ўзнікла многа праблем, і ад такой формы прыйшлося адмовіцца.

**— Адкуль усё ж узяўся «чалавек у акулярах»?**

— Справа ў тым, што калі праграма была ўжо амаль падрыхтавана, паўстала праблема рэжысёра. Мы запрасілі Ваню Дзямідава, які да гэтага ніколі музычных праграм не рабіў, але прыйшоўся да спадобы. Менавіта ён знайшоў такую цудоўную форму звязкі і падачы інфармацыі. Цяпер Ваня стаў сімвалам «Музабоза».

**— Пытанне больш сур'ёзнае: ці мае перадача сваю канцэпцыю або выкарыстоўвае прынцып вінегрэту?**

— Канцэпцыі, на жаль, пакуль няма. Мы ведаем, што не зусім маем рацыю, застаючыся такімі бесхрыбетнымі, але інфармацыйная праграма, магчыма. і не павінна мець ніякай канцэпцыі.

**— Ці няма ў вас сапerніцтва, канфрантацыі з іншымі музычнымі праграмамі?**

— Можа мой адказ прагучыць не зусім па тэме, але раздражняе, калі нават знаёмыя лічаць, што «Музабоз» і «Шоу-біржа» — адно і тое ж. «Шоу-біржа» была прыдумана вядомым дзяльцом ад «блакітнай» музыкі Лісоўскім, з якім звязана маса скандалаў.

**— А ўсялякія «50×50»...**

— У адносінах усіх гэтых Беняў Жэлаўсавых, гэтых вырадкаў, дэгенератаў, у нас з Марынай адразу была дакладная ўстаноўка — каб у «Музабозе» ўсёй гэтай погані не было. Вось у сваіх «50×50» хай і з'яўляюцца.

**— Тым не менш, Алег Газманаў калі-нікалі ды і з'яўляецца ў вашай праграме...**

— Прычына гэтага самая банальная: наш рэжысёр — сябар Газманава, вось і паказваем «Сталкер», Газманава, «Тэхналогію». Праўда, апошні займаецца Айзеншпіс, а ён нам шмат дапамагаў, але гэта ўжо іншая размова.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

23 красавіка

Зак. 2187.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.